# Ларыса ГРЫБАЛЁВА: “Чалавек вучыцца

**Яна паспела паспрабаваць сябе ў шматлікіх творчых прафесіях і да гэтага часу застаецца вернай кожнай з іх. Яна не баіцца эксперыментаваць і заўсёды знаходзіцца ў працэсе самаўдасканалення. Пры шчыльным працоўным графіку ёй удаецца заставацца ўважлівай дачкой, каханай жонкай і клапатлівай маці. Сёння ў гасцях рубрыкі “Мая школа” вядомая беларуская спявачка, тэлевядучая, актрыса, бізнес-лэдзі Ларыса ГРЫБАЛЁВА.**



***— Ларыса, за які перыяд жыцця вы больш за ўсё нечаму навучыліся?***

— Я не магу так сказаць, што ў нейкі перыяд свайго жыцця я нечаму навучылася больш, а нечаму менш. Кожны год падкідвае мне новыя занятки, якім можна навучыцца, таму я лічу, што чалавек, які мае актыўную жыццёвую пазіцыю, вучыцца ўсё жыццё. А я?.. Можа, я і не навучылася зусім, і ў мяне ўсё яшчэ наперадзе...

***— Калі, на вашу думку, быў закладзены фундамент вашага характару і актыўнай жыццёвай пазіцыі? Вашы няўрымслівасць і энергічнасць — гэта гены, сямейнае выхаванне ці пастаянная работа над сабой?***

— Я ўпэўнена, што з цягам часу чалавек не мяняецца. У кожным з нас закладзены генатып, які потым змяніць нельга. Безумоўна, на станаўленне асобы ўздзейнічае і сацыяльнае асяроддзе, у якім ты жывеш, і адносіны ўнутры сям'і, у школе. Усё гэта ўздзейнічае на нас адметным чынам у залежнасці ад таго, з якім характарам і тэмпераментам ты нарадзіўся. І станаўленне маёй асобы праходзіла і будзе праходзіць на працягу ўсяго жыцця.

***— Ці памятаеце, як пайшлі ў першы клас?***

— Я амаль не помню, як пайшла ў школу, але добра помню свае адчуванні. Я добра разумела, што трэба штодня хадзіць у школу і вучыцца, і гэта асаблівага шчасця ў мяне не выклікала. Таму, відаць, і да паходу "першы раз у першы клас" у мяне стаўленне было абсалютна абыякавае. Аднак школа з самага пачатку стала сімвалам пераходу ў самастойнасць і дарослае жыццё: я сама на аўтобусе ездзіла ў школу і са школы — большую ролю адыгрываў элемент самастойнасці, чым само навучанне. Для мяне гэта было прыгодай, магчымасцю дзейнічаць без бацькоўскіх указанняў.

У сям'і ў нас было вельмі строгае выхаванне. Бацькі мяне мала куды адпускалі, таму, калі я пайшла ў школу, мама, Валянціна Сямёнаўна, неяк сказала: "Як пайшла, так і пайшла з дому". Гэта было неасэнсаванае ўступленне ў дарослае жыццё.

***— Якія ўспаміны засталіся пра першую настаўніцу?***

— У першы клас я пайшла ў сярэднюю школу № 7 Полацка (зараз полацкая гімназія № 1), таму што якраз у гэты час бацьку, Уладзіміра Васільевіча (а ён у мяне быў ваенным), перавялі ў Полацк. Маю першую настаўніцу звалі Тамара Міхайлаўна. На жаль, яна вельмі рана памерла з-за хваробы... У нас быў вельмі добры клас, вельмі дружны (у многім дзякуючы Тамары Міхайлаўне), і я сёння больш памятаю аднакласнікаў з пачатковай школы, чым тых, хто вучыўся са мной пазней.

Частка маіх аднакласнікаў жыла ў ваенным гарадку Баравусе-3, і таму мы адной кампаніяй ездзілі на аўтобусе з аднаго канца горада ў другі ў школу і дадому. І здагадайцеся, хто кіраваў усім гэтым "калгасам"? Правільна, я.

Калі скончыла 5 класаў, бацьку перавялі ў Благавешчанск-на-Амуры, і я вярнулася ў Полацк толькі ўжо будучы студэнткай 2 курса педінстытута. Прыйшла на вечар сустрэчы з выпускнікамі. Аказалася, што ўсе збіраліся толькі ў школе. Канечне, я запрасіла ўсіх да сябе ў госці (мы з бацькамі толькі пераехалі — усё было яшчэ па скрынках і чамаданах), і мы адзначалі нашу сустрэчу. Пасля гэтага я падумала: і як гэта яны ўсе без мяне тут жылі? Але пасля таго мы і не збіраліся ў вялікім складзе. Мае аднакласнікі параз'язджаліся хто куды, і сабраць усіх зараз ужо амаль нерэальна.

У нашай школе было паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, і, дзякуючы добрай моўнай базе, многія з маіх аднакласнікаў змаглі зрабіць за мяжой сабе добрую кар'еру: нехта працуе доктарам, нехта працуе ў ІТ-сферы, але ва ўсіх усё склалася добра.

***— Каго з аднакласнікаў вы б зараз хацелі ўбачыць?***

— Вельмі б хацела сустрэцца з маёй кампаніяй з Баравухі. З радасцю б убачыла Дзіму Паруля (яго бацька аперыраваў мне апендыцыт). Дзіма зараз жыве ў Амерыцы, і неяк мы з ім знайшліся ў "Аднакласніках", але я потым выдаліла анкету з гэтай сацыяльнай сеткі і мы зноў згубіліся. Вельмі хацела б убачыць Алега Мазо (ён, здаецца, жыве ў Ізраілі). Дзяўчат, з якімі сябравала, не так даўно бачыла. Хацела б зноў сустрэцца з Ленай Грышчанковай — яна зараз жыве ў Рыме, і калі мы з дзецьмі там адпачывалі, Лена нам дапамагала арыентавацца ў Італіі і перамяшчацца па яе тэрыторыі. Было б добра пабачыцца з Юляй Ганчаровай, якая жыве ў Кіеве. Таня Варзова так і жыве ў Баравусе, але мы амаль не бачымся: і я рэдка там бываю, і яна не вельмі сябруе з сацыяльнымі сеткамі.

Неяк на "Аднакласніках" мяне знайшоў мой школьны выкладчык англійскай мовы Сямён Давідавіч, які зараз жыве ў Ізраілі. Шчыра кажучы, было вельмі прыемна, што з агульнай масы вучняў ён запомніў мяне. Ён сам мне напісаў, нагадаў аб сабе. Такога настаўніка забыць нельга. Ён быў педагогам ад Бога: тых ведаў, якія я атрымала за першыя пяць гадоў у школе, мне хапіла, каб паспяхова адвучыцца да 11 класа, а потым яшчэ і на інстытут хапіла.

На жаль, у Благавешчанску не было ні адной спецыялізаванай школы з англійскай мовай (мне было дзіўна, бо горад даволі вялікі). Так англійская мова была ўпушчана і з-за адсутнасці неабходнасці ў ёй забыта. Сёння праходзіцца з англамоўнымі людзьмі знаходзіць паразуменне праз жэсты, рухі і некаторыя не забытыя яшчэ словы.

***— Якія школьныя прадметы і школьныя педагогі запомніліся?***

— У Полацку ў мяне быў цудоўны педагог па фізкультуры. Я не ўмела плаваць, але ўсё роўна атрымлівала значкі ГПА. Канечне, плаваць ён мяне навучыў, але наколькі смешна выглядала, калі мяне ў басейне "вадзілі" з палкай, а потым я атрымлівала разрад ГПА. Неяк здымалася праграма пра аднакласнікаў, і гэты педагог нават прыязджаў на здымкі.

***— Але ж, акрамя Полацка, у вашым школьным жыцці ёсць яшчэ Благавешчанск.***

— Прыйшоўшы ў сярэднюю школу №1 Благавешчанска, я адразу адчула на сабе павышаную ўвагу з боку і дзяўчат, і асабліва хлопцаў. Вельмі цяжка ацэньваць настаўнікаў пасля таго, як у пачатковай школе цябе вучыць адзін педагог, які за чатыры гады становіцца і сябрам, і дарадцам. Асабліва вучобу ў Благавешчанску не помню, але ва ўспаміны моцна ўрэзаўся вобраз нашага настаўніка фізікі. Ён быў вельмі высокі і няскладны. Відаць, з-за гэтага ў яго заўсёды былі кароткія штаны, з-пад якіх выглядалі чырвоныя шкарпэткі, якія разам з карычнева-рудым колерам касцюма і ўскалмачанымі валасамі стваралі ўражанне сапраўднага прусака, якім у Благавешчанску жылося вельмі свабодна. Пры ўсёй знешняй няскладнасці ён быў педагогам ад Бога: цудоўна ведаў свой прадмет і мог улюбіць у яго, відаць, любога вучня... Але са мной такі нумар не прайшоў.

Гісторыю выкладала наш класны кіраўнік Аляксандра Кушнярук — суперцярплівая і стойкая жанчына. Яна была родам з Брэста і прыехала ў Благавешчанск разам з мужам-ваенным (потым у 1998 годзе я неяк выпадкова сустрэлася з ёй у Брэсце). Яна была настолькі спакойнай, што "не заўважала", як мы з аднакласнікамі на ўроку абмяркоўвалі свае праблемы: мы пра свае гаварылі, яна пра свае, адно аднаму не перашкаджаючы, кожны займаўся сваёй справай.

***— Ведаю, што пасля школы рыхтаваліся вучыцца ў адным інстытуце, паступілі ў другі, а скончылі трэці. Раскажыце, калі ласка, як так здарылася?***

— Па рэкамендацыі маці (а яна ў мяне працавала бухгалтарам) я рыхтавалася да паступлення на эксперыментальную па тым часе спецыяльнасць "Эканоміка знешніх сувязей" у Благавешчанскі філіял Санкт-Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Разважалі так: паступлю сюды, а потым буду ў Піцеры вучыцца. З дакладнымі навукамі ў мяне ўсё было заўсёды добра, але я ўсё ж год хадзіла на падрыхтоўчыя курсы.

Напярэдадні ўступных экзаменаў бацькі паехалі ў санаторый (я да гэтага часу не магу зразумець, як мама з яе гіперадказнасцю магла кінуць мяне адну ў такі складаны час). І я не разгубілася. Маці тэлефанавала і пыталася, як я здала экзамены — у мяне было ўсё на "выдатна". І толькі калі яны вярнуліся з водпуску, а прыёмная кампанія была завершана, бацькі даведаліся, што я паступіла... у педагагічны інстытут на спецыяльнасць "Пачатковыя класы" (увогуле, маёй марай было стаць выхавальніцай дзіцячага сада, але мяне ад гэтага адгаварылі). Канечне, бацькі былі ў лёгкім шоку, але да скандалу не дайшло — гэта быў не першы мой учынак, калі я, наперакор усім, зрабіла па-свойму. У гэтым плане — зрабіць па-свойму — у нашай сям'і ўсе жанчыны такія: і мая маці, і сястра, і я, і мая дачка Аліса...

***— Відаць, гіперадказнасць таксама перадаецца ў вас па жаночай лініі?***

— Пра маму і мяне гэта абсалютна так, а вось Аліса, на маю думку, яшчэ не дарасла да гэтага — пакуль для мяне гэта толькі капрызы...

***— Ці давялося вам папрацаваць па атрыманай спецыяльнасці?***

— Нягледзячы на тое, што я дыпламаваны педагог, склалася так, што ў школе я працавала толькі падчас педагагічнай практыкі на 4 курсе. Усе заліковыя ўрокі правяла на выдатна, ды і паразуменне з дзецьмі знайшла. Мне сапраўды падабалася гэтая работа. Рыхтуючыся да ўрокаў, сваімі рукамі рабіла многа дыдактычных матэрыялаў (тады не было такой разнастайнасці кніг і рабочых сшыткаў). Калі зразумела, што ў школе не буду працаваць, перадала сваім дзяўчатам і дыдактычны матэрыял, і назапашаную метадычную літаратуру.

У мяне ўсё было добра і гладка, без эксцэсаў, у адрозненне ад іншых. Памятаю, адну з маіх аднакурсніц з практыкі завезлі ў бальніцу, бо адзін з вучняў падставіў ёй падножку і практыкантка атрымала страсенне мазгоў. Праз пэўны час на дыскатэцы ў Мінску было смешна сустракаць сваіх вучаніц, вышэйшых за цябе на дзве галавы, якія казалі: "Ларыса Уладзіміраўна, ці памятаеце вы..." (*Смяецца.*)

Падчас практыкі было некалькі цікавых выпадкаў. Прозвішча Грыбалёва сустракаецца на Беларусі нячаста, і вось тата аднаго з маіх вучняў, таксама Грыбалёў, прыходзіць да мяне знаёміцца і высвятляць, ці не сваякі мы. Аказалася, што проста цёзкі па прозвішчы. Быў таксама Сыраежкін — тыпаж такі, што хоць у кіно яго здымай. Яго аддалі ў першы клас у шэсць гадоў, але хлопчык быў зусім не гатовы да навучання: не мог уседзець 45 хвілін, часам збіраў партфель і сярод урока ішоў дадому, сварыўся з дзецьмі і настаўніцай. Наколькі я памятаю, яго бацькам усё ж даказалі, што іх дзіця не гатова да школы, і хлопчык зноў пайшоў у першы клас праз год.

***— Як у вашых дзяцей з вучобай? Ці даводзіцца ім дапамагаць, выкарыстоўваючы педагагічныя веды?***

— Арсеній скончыў чатыры класы, Аліса — пяць. З вучобай у іх, як ва ўсіх: ніхто не хоча вучыцца. (*Смяецца.*) Прызнаюся шчыра, задачкі па матэматыцы ў 5 класе з Алісай рашаў дзядуля — я, відаць, страціла кваліфікацыю. (*Смяецца.*) Зараз, летам, трэба будзе аднавіць у памяці праграму, паглядзець шэраг відэаўрокаў і дапамагчы Алісе зразумець матэматыку. Настаўніца сказала, што калі ўпусціць 5—6 класы, далей матэматыку ўжо ніколі не нагоніш. Так што у нас у планах — падрыхтоўка да наступнага навучальнага года.









***— Які школьны прадмет вы больш за ўсё не любілі?***

— Я не любіла гісторыю. Запамінаць імёны, даты, падзеі, — не для мяне. Я нават сёння ў гісторыі поўны нуль. Калі нешта ведаю, то гэта хутчэй на інтуітыўным узроўні. Па ironії лёсу мая родная сястра Вольга — гісторык. Яна ўставала ў 6 гадзін раніцы і вучыла гісторыю. Калі я бачыла ў яе на стале стосы кніг па розных гісторыях: старажытнага свету, Рыма, Грэцыі, сярэдніх вякоў, СССР, БССР, КПСС і інш. — мяне прабіралі дрыжыкі. Не ведаю, ці ўспомніць яна што-небудзь з гісторыі, бо, скончыўшы педінстытут, яна пайшла працаваць... цыркавой артысткай.

***— Ці дапамагае наяўнасць педагагічнай адукацыі ў іншых сферах вашай дзейнасці?***

— У педінстытуце нам выкладалі шмат псіхалогіі і педагогікі. Мне гэта вельмі падабалася, і было вельмі цікава на гэтых занятках.

# ўсё жыццё”

Аказалася, што менавіта гэты бок маіх ведаў аказаўся найбольш запатрабаваны.

***— Паступленне ў інстытут культуры было, я разумею, прафесійна неабходным?***

— Калі вучылася на апошніх курсах педінстытута, маімі вакальнымі здольнасцямі зацікавіўся Валерый Антонавіч Дамарацкі. Менавіта ён пазнаёміў мяне з маэстрам Фінбергам, а потым прапанаваў паехаць на вакальны конкурс “Маладзечна-94”. Каб трапіць у аркестр у якасці вакалісткі, трэба было быць не менш як лаўрэатам конкурсу. У мяне была такая задача.

Потым, канечне, узнікла неабходнасць атрымаць музычную адукацыю, і мой выбар спыніўся на вакальным аддзяленні тагачаснага інстытута культуры. Цікава тое, што калі я заканчвала свае інстытуты, яны праз год ставаніліся ўніверсітэтамі.

***— Вы праявілі сябе ва ўсіх магчымых відах дзейнасці: эстрада, тэлебачанне, кіно, тэатр, бізнес... Вы жонка і маці... У чым бы яшчэ хацелася паспрабаваць свае сілы?***

— Сёння мне дастаткова тых сфер дзейнасці, у якіх я сябе праявіла. Зараз трэба паглыбляць пачатыя напрамкі — капаць глыбей. Я ўжо засумавала па камеры і з задавальненнем узяла б удзел у якім-небудзь тэле- ці кінапраекце.

***— Хто былі вашымі настаўнікамі ў шматлікіх прафесіях?***

— Маім першым педагогам па вакале была кіраўнік вакальнага гуртка “Вясёлка” Благавешчанскага палаца піянераў Галіна Паўлаўна Халас. У нечым яна была фанатычным педагогам: у мяне не было асаблівых вакальных даных, але я заўсёды добра трымала партыю ў хоры і ансамблі, і мне вельмі хацелася выступаць на сцэне. Яна бачыла гэта, верыла ў мае магчымасці і вельмі многа са мной займалася. Я пастаянна ўдзельнічала ў шматлікіх канцэртах. Перад ад'ездам з Благавешчанска ў мяне нават быў развітальны сольны канцэрт: з афішамі, артыкуламі ў газетах... І, шчыра кажучы, я думала, што на гэтым мая канцэртная дзейнасць скончыцца...

Але, на шчасце, у Віцебскім педінстытуце не без дапамогі стрыечнай сястры Наталлі, якая вучылася там, мяне заўважыў Валерый Антонавіч Дамарацкі. Ён паслухаў мяне і ўзяў пад сваё “крыло”. Спявалі мы тады вядомыя эстрадныя кампазіцыі (зараз бы нас назвалі кавер-бэндам), а таксама песні, якія пісаў Валерый Антонавіч. Працавалі ў рэстаранах, на вяселлях, на разнастайных мерапрыемствах. Менавіта ён сказаў, што я павінна ісці далей. І менавіта ён парэкамендаваў мне ісці далей: нават не парэкамендаваў, а загадаў.

Я вельмі сумнявалася, што ў мяне атрымаецца трапіць у аркестр Фінберга, але ўсё атрымалася: і ўдалае выступленне на конкурсе ў Маладзечне, і работа ў якасці салісткі аркестра.

Так на працягу 16 гадоў маімі настаўнікамі сталі музыканты аркестра і сам Міхаіл Фінберг. Усе яны былі з кансерваторскай адукацыяй, а я нават элементарнай музычнай школы не мела за плячыма. За гэты час навучылася правільна дыхаць, правільна падаваць голас, змагла паспрабаваць спяваць усё, што магчыма было спяваць.

Канечне, і вучоба ў інстытуце таксама дапамагала. У мяне быў цудоўны педагог па вакале Фёдар Міхайлавіч Севасцьянаў. Ён не “ламаў” сваіх студэнтаў, не навязваў сваю выканальніцкую тэхніку, а карэкціраваў нашу індывідуальнасць.

Калі гаварыць пра тэлебачанне, то найперш трэба назваць Ягора Хрусталёва, Уладзіміра Максімкава і нашага аператара Сяргея Навікава, якія проста ўлюбілі мяне ў камеру, далі магчымасць паверыць у сябе як у тэлевядучую. Канечне, шмат дало знаёмства і работа з вядомым на ўвесь былы Савецкі Саюз Юрыем Нікалаевым, мабыць, першым вядучым забаўляльнага вяшчання. Працуючы з ім у праграме “Ранішняя пошта”, я павінна была адпавядаць яму, таму работа ў Маскве стала перыядам актыўнага самаўдасканалення. З Нікалаевым працавалі недзе год, потым у тэлеканала “ГРТ”, відаць, скончыліся грошы. Не на мяне, а на Нікалаева. (*Смяецца.*)

Думаю, гледачам запомнілася забаўляльная праграма “Усё нармальна, мама!”, якую мы здымалі ў Мінску паралельна з расійскай “Ранішняй поштай”. (Спачатку перадача выходзіла па-беларуску, але потым ёй зацікавіліся ў Маскве, і мы перайшлі на рускую мову, бо нашы праграмы сталі закупляць для начнога расійскага эфіру.) Мне прыходзілася разрывацца паміж Мінскам і Масквой, але гэта быў драйв! Мне прапаноўвалі застацца ў Маскве, але тут, у Мінску, была мая праграма “Усё нармальна, мама!”, якую я любіла больш, чым “Ранішнюю пошту”, работа ў аркестры — якараў, якія трымалі ў Беларусі, было больш.

Пасля Нікалаева я пэўны час вяла праграму адна. Памянялася аператарска-рэжысёрская група, здымаць “Ранішнюю пошту” стаў Андрэй Балтэнка (і ён сам, і хлопцы, якія з ім працавалі, былі родам з Украіны). Здымаць “Ранішнюю пошту” ён не любіў — гэта была проста частка яго работы, а вось у астатнім ён быў поўны крэатыву. Здымкі канцэртаў былі яго каньком: ён выкарыстоўваў разнастайныя прыдуманыя ім спецэфекты. Напрыклад, мог на тросе падвесіць камеру, якую разгойдвалі і стваралі эфект лятаючай камеры. (Гэта зараз існуе мноства тэхнічных прыстасаванняў, як, напрыклад, аператарскія краны — у той час пра іх нават не чуў ніхто.)

Ужо тут, у Мінску, мне пашчасціла зноў папрацаваць з Юрыем Нікалаевым, калі мы сталі здымаць “Ранішнюю пошту” для тэлеканала “РТР-Беларусь”.

***— Ці задаволены вы тым, што ў вас ёсць на сённяшні дзень?***

— Усё роўна хочацца далей, больш, вышэй... У мяне ніколі не было такіх камфортных умоў, каб я магла проста адпачываць. Я адразу ўзяла вельмі высокія планкі ва ўсіх сферах жыцця. Не магу сказаць, што зараз знаходжуся на грэбені хвалі — відаць, больш лагічна ахарактарызаваць сённяшні час як час стабільнасці. Але ўсе тыя сферы дзейнасці, якія зараз у маім полі зроку, хацелася б развіваць далей.

***— Ваша ідэя івент-агенцтва была ўспрынята многімі неадназначна, маўляў, для нашай краіны гэта неактуальна. Вам прыходзілася змагацца за рэалізацыю гэтага праекта?***

— Зараз працаваць дастаткова складана, таму што падобных фірм вельмі многа. А напачатку пайшло ўсё даволі гладка: была ідэя, каманда, нікім не заняты рынак. Да таго ж буйныя кампаніі сталі ў той час задумвацца пра карпаратыўную культуру. З самага пачатку, з 2004 года, мы не пазіцыяніравалі сябе як вясельнае агенцтва ці агенцтва дзіцячых свят. Мы заявілі пра сябе як пра агенцтва, якое займаецца падзейным маркетынгам (хаця такога тэрміна ў той час ніхто і не ведаў), і з іншых святочных агенцтваў мала хто ведаў, што такое цімбілдынг. Асаблівасць нашай работы ў тым, што трэба ўвесь час развівацца, шукаць новых кліентаў, бо юбілеі пастаянных заказчыкаў не кожны год, прыдумваць новыя формы баўлення часу — наша каманда ўвесь час у пошуку.

***— Не так даўно вы прымералі на сябе новае амплуа — тэатральнай актрысы. Як вам у гэтай іпастасі?***

— Усё пачалося вельмі цікава. Я, Ягор Хрусталёў і Уладзімір Максімкаў выпадкова сустрэліся на монаспектаклі Канстанціна Хабенскага “Кантрабас”. (Усе прыйшлі па запрашэнні розных людзей, але апынуліся на крэслах побач.) Ідэя “нешта зрабіць” з'явілася адразу. І на наступны дзень хлопцы мне даслалі п'есу Альда Нікалаі “Два падкаблучніка”. Я не ўспрыняла гэта сур'ёзна, бо яны намнога больш занятыя, чым я, і, шчыра кажучы, я не спадзявалася, што гэтая авантура атрымаецца. Спачатку мы глядзелі на гэта як на прыгоду, але потым вырашылі запрасіць рэжысёра. Так мы сталі працаваць з Сучасным мастацкім тэатрам. Кіраўнік тэатра Уладзімір Ушакоў запрасіў маскоўскага рэжысёра. Рэпетыцыі ішлі кожны дзень (бывала, што і па два разы на дзень) на працягу двух месяцаў. Мы атрымалі каласальнае задавальненне, але я атрымала б яго яшчэ больш, каб была вольная ад іншай работы — тэатр не церпіць сумяшчэння з нечым іншым.



Спектакль прайшоў толькі аднойчы (мы не збіраемся адбіраць хлеб у прафесійных акцёраў), і для нас быў больш прыгодай, чым работай.

***— Калі б вам зараз прапанавалі зноў паказаць спектакль, пагадзіліся б?***

— Справа ў тым, што Валодзя Максімкаў адразу паехаў падарожнічаць, і я да гэтага часу яго яшчэ не бачыла. Гэта павінна быць калегіяльнае рашэнне. Была размова пра тое, каб увесці ў спектакль іншых акцёраў, але гэта немагчыма — спектакль можа існаваць толькі ў такім складзе. Але я была б не супраць, каб мяне ўвялі ў які іншы спектакль тэатра, бо мне гэта цікава.

***— Ці падабаецца вам работа ў кіно? Калі б нехта пагадзіўся напісаць сцэнарый “пад вас”, якая б гэта была роля?***

— Я больш раскрываюся як камедыйная актрыса, і мне б хацелася сыграць кагосьці-небудзь падобнага да мяне самой. Я не актрыса — ролі на перааддоленне мне іграць вельмі складана. У адным з фільмаў Астрахана мне трэба было прызнавацца мужчыне ў каханні, і я адразу сказала рэжысёру, што не сыграю гэта... Але ролю адужала.



З бацькамі і сястрой.



З мужам і дзецьмі.

У гэтым годзе ездзіла на кастынг у адно з вядучых кінакастынгавых агенцтваў, дзе, на здзіўленне, атрымала катэгорыю “профі”. Відаць, паўплываў мой практычны вопыт работы на тэлебачанні...

***— Калі б вам прапанавалі ўдзел у вялікім праекце, які б патрабаваў пастаяннай прысутнасці на пляцоўцы, ці змаглі б адмовіцца ад сваіх іншых занятак?***

— Быў час, калі мы за тыдзень здымалі па тры праграмы. Гэта аднімала шмат часу. Я прывыкла жыць у хуткім тэмпе, і гэта мяне не пужае. Ну і што, жыла б у цягніку ці ў самалёце. Зараз жыву ў гастрольным аўтобусе. (*Смяецца.*)

***— Ларыса, чаму вас навучылі бацькі?***

— Думаю, лепш было б у іх спытаць, чаму яны мяне вучылі. (*Смяецца.*) У нашай сям'і была вельмі строгая сістэма выхавання. Самай першай справай пасля школы былі не ўрокі, а штодзённая ўборка кватэры. Потым я абедала, мыла за сабой посуд і толькі потым садзілася за ўрокі. Да 11 класа мама правярала ў мяне ўрокі, таму часам прыходзілася хітраваць. Напрыклад, з англійскай мовай. Мама яе не ведала і адпраўляла правяраць дамашняе заданне да сястры, а з ёй мы ўжо дамаўляліся: “Ты за мяне мыеш посуд, а я скажу, што ты ўсё вывучыла”. (*Смяецца.*)

У спадчыну ад маці я атрымала гіперадказнасць, а ад бацькі — любоў да людзей. Калі мы будавалі дом, ён узяў на сябе значную частку ўсёй работы. Але калі прыходзілі будаўнікі, найперш ён ім прапаноўваў паесці і чаю папіць, а потым ужо займацца работай. І нават калі нешта нехта рабіў дрэнна, ён не сварыўся: “Ну, як зрабілі — так зрабілі, тут падкручу, тут падмажу, і будзе ўсё добра”.

У нашай сям'і заўсёды панавала вялікая любоў. Па прафесіі ваенны — тата, а ў жыцці — мама. Бязмежная бацькава любоў і прыязныя адносіны да нас, дачок, зрабілі з нас тых, хто мы ёсць зараз.

***— Ці мелі дачыненне да вашага выхавання бабулі?***

— На працягу некалькіх гадоў, калі бацькі два гады працавалі ў Афрыцы, маю старэйшую сястру выхоўвалі бабуля Лена (бацькава маці) і бабуля Аня (маці маёй маці). Але большая нагрузка ўсклалася на бабулю Лену, бо яна была настаўніцай пачатковых класаў (менавіта ад яе ў нас з сястрой любоў да педагогікі). Калі я перавялася з Благавешчанска ў Віцебскі педінстытут, таксама некаторы час жыла ў бабулі Лены. Хто каго выхоўваў у гэты час, ужо невядома. (*Смяецца.*) Кожную раніцу бабуля ўставала разам з першым сігналам радыёкропкі і выключала яго, каб я магла яшчэ паспаць, лежачы ў ложку, яна кожную раніцу рабіла зарадку — старалася заўсёды добра выглядаць, фарбавала вусны, хаця акрамя яе самой гэтага амаль ніхто не бачыў. Да самых апошніх дзён яе наведвалі былыя вучні, і яна радасна сустракала іх, памятаючы кожнага па імені.

***— Ці праўда, што ў сваім доме вы самі клеілі шпалеры?***

— Я ж вырасла ў сям'і ваеннага, і жыццё ў кожнай новай кватэры пачыналася з пераклейвання шпалераў. Так што я з дзяцінства ведала, як гэта робіцца, а мае бацькі паспелі на гэтым набіць руку. У іх нават ёсць свая “сакрэтная” тэхналогія. (*Смяецца.*)

***— Што для вас зараз з'яўляецца самым вялікім шчасцем?***

— Хочацца спакою і міру, і каб дзеткі былі здаровыя.

***— Што б сказалі ўсім настаўнікам краіны?***

— Быць добрым настаўнікам — гэта Божы дар. Я хацела б выказаць усім педагогам вялікую падзяку за іх работу. Гэта вельмі цяжкая прафесія. Мабыць, настаўнікам, асабліва пачатковых класаў, найцяжэй працаваць нават не з дзецьмі, а з бацькамі, бо для кожнага менавіта яго дзіця самае таленавітае і самае лепшае, а педагогам прыходзіцца гаварыць падчас вельмі горкую праўду.

Цярпення вам, дарагія настаўнікі, здароўя і педагагічнай пераменнасці. А тым, хто збіраецца паступаць у педагагічныя ВНУ, хачу параіць, каб яны паступалі туды не таму, што ў гэтыя ВНУ прасцей паступіць, а па покліку сэрца, па прызванні.

**Гутарыў Уладзімір ФАЛАЛЕЕЎ.**
*public@nastgaz.by*
**Фота з асабістага архіва Ларысы Грыбалёвай.**